**Краснова Н. Дз. (Мінск)**

# «Смаленне вепрука» як канцэптуальны вобраз у апавяданнях М. Стральцова і А. Федарэнкі.

*«Дабро і надзея тут накрэслілі свой круг»* [1, с. 182] – менавіта такім выразам завяршае сваё самае знакамітае апавяданне Міхась Стральцоў. Але ўсім вядома, што канец – гэта толькі пачатак новай гісторыі…

У жыцці беларусаў як славянскага, земляробчага этнасу вялікую ролю адыгрываюць традыцыйныя рытуалы, звязаныя з календарным кругабегам часу. Калі мы паспрабуем бліжэй разглядаць сялянскае жыццё, то лёгка заўважым, што яно нагадвае кола. Тое, што на першы погляд падаецца канцом усяго, атрымліваецца пачаткам чагосьці новага, якое аддалена нагадвае старое.

Адной з важнейшых падзей у побыце вёскі з’яўляецца збор ураджаю і нарыхтоўка мяса з жывёлы, здабытай на хатняй гадоўлі. Падзея свежавання, смалення вепрука, дзяльбы кабанчыка цесна звязана з жыццёвым укладам усіх беларусаў, бо яна яшчэ з часоў глыбокай даўніны была неад’емнай часткай іх жыцця і лічылася (а мне здаецца, і лічыцца сёння) сапраўдным святам для былых і цяперашніх вясковых жыхароў. Смаленне вепрука вельмі часта адлюстроўваецца ў беларускім мастацтве, і вобразнае асэнсаванне гэтага дзейства набыло канцэптуальнае значэнне, ператварылася ў вобраз-канцэпт [5, 22]. Канцэпт – гэта складаны комплекс сэнсаў, пэўным спосабам

структураваная сістэма ўніверсальных і індывідуальных значэнняў, якая дазваляе адэкватна спасцігнуць логіку аўтарскай задумы ці хоць бы наблізіцца да яе, убачыць свет вачыма пісьменніка і як непаўторна-ўнікальнай асобы, і як прадстаўніка сваёй нацыі і сваёй краіны, і як чалавека ўніверсальнага, носьбіта прапамяці, прагісторыі, пракультуры.

Цэнтральнае месца такі вобраз займае ў апавяданні М.Стральцова “Смаленне вепрука” (1973 г.). Яно лічыцца вяршыняй творчасці пісьменніка. Аўтар нарадзіўся ў вёсцы, потым пераехаў у горад, і назаўсёды застаўся недзе паміж горадам і вёскай [3, с. 12]. Каму, як не яму ведаць усе тонкасці вясковага жыцця!

І ён ведае.

Ён хацеў напісаць апавяданне пра тое, як смаляць у вёсцы вепрукоў, пра сына, які, як некалі і ён сам, з’ехаў з роднай вёскі ў горад працаваць, але вельмі часта ўспамінаў бацькоўскую хату, а назваць гэтае апавяданне ён хацеў так: «Смаленне вепрука». І ён напісаў апавяданне.

Ужо напачатку твора адразу ж паўстаюць вясковыя малюнкі (потым яны не аднойчы паўтараюцца), якія задаюць і на працягу ўсяго апавядання трымаюць экзістэнцыйны тон твора, адчуванне драматызму і тугі.

Цэнтральным вобразам апавядання я лічу вепрука, усе астатнія вобразы знаходзяцца як бы ў яго семантычным полі – гэта значыць, набываюць сваё цэласнае значэнне толькі ў сувязі з гэтым вобразам. Аўтар паказвае нам перажыванні хатняй жывёлы, якая прадчувае надыходзячую смерць, але не можа ёй супрацьстаяць і якая абавязкова павінна пагадзіцца са сваім конам. Разумее гэта маленькая жывёла ці не – вядома ёй адной, але Міхась Стральцоў надзяляе яе свядомасцю і малюе шматзначны вобраз: «*...есці яму сягоння дадуць чым пазней, каб так, угаладаўшыся, лягчэй абмінуў ён здагадку пра тое, што прызначана яму на гэты дзень. Але ж гэта, можа, і насцярожвае яго. І адчыняюцца сенцы, і бухаюць дзверы, прадракаючы між нечакана хісткай, поўнай незразумелага сэнсу цішыні*» [1, с. 175–176].

Мы бачым, што вяпрук з’яўляецца ахвярай маленькага жыццёвага тэрміну, які па часе абмежаваны годам. Менавіта яго смерцю і замыкаецца гадавое кола.

Каля вобраза вепрука аўтар паказвае вобразы гаспадара і гаспадыні, сына, які прыехаў з горада ў вёску, і яго маці, што засталася на іх малой радзіме. У артыкуле «Вусцішнасць быцця» Валянцін Акудовіч заўважыў: «*У «Смаленні вепрука» ён* [М. Стральцоў. – Н. К.] *перажыў свой метафізічны сыход. Тут невараць урэшце запанавала ўсюды, і найперш у ім самім. Ён сам быў тым, каго забіваюць, ён сам быў тым,*

*хто забівае, ён сам з сябе склаў ахвярнае вогнішча і сам быў тым ахвярным дымам, што завершыў яшчэ адзін кругазварот быцця.*

*З тым дымам ён адышоў у нябёсы, «а душа ўзяла і засталася», затрымалася на нейкі час і вярэдзіць маю душу ягоным сумам па немагчымасці інакш пазбегнуць смерці, як толькі памерці»* [4, с. 28].

І атрымалася ў Міхася Стральцова эпітафія апавяданню, якое павінна было быць напісана. Як лічаць многія даследчыкі, эпітафія была напісана не толькі апавяданню, але і ўсёй празаічнай творчасці пісьменніка. Як вядома, гэта было апошняе апавяданне, пасля яго Міхась Стральцоў пісаў толькі паэзію, літаратурна-крытычныя артыкулы, рабіў пераклады.

Чытаючы апавяданні М. Стральцова, заўважаем, што яны напісаны нібыта вершаванай мовай. У ёй адчуваецца дасканалая рытмічная арганізацыя.

У апавяданні «Смаленне вепрука» надзвычай яскрава і глыбока выяўлена экзістэнцыйнае светаадчуванне. Усяму жывому наканавана памерці. І вельмі часта жывая істота – будзь то жывёла ці сам чалавек – прадчувае набліжэнне апошняй хвіліны. Страх смерці, але і надзея засцерагчыся ад яе ў вялікай ступені вызначаюць увесь змест апавядання «Смаленне вепрука». У творы М. Стральцова падзея, што мела ў беларускай культуры значэнне перамогі селяніна над нябытам, мела жыццясцвярджальны ў цэлым пафас, упершыню найвыразна набыла процілеглае значэнне. Канцэптуальны вобраз смалення вепрука ў М. Стральцова азначае не ўхваленне працы чалавека, а пацвярджэнне непазбежнасці смерці, агульнай для ўсяго жывога. Гаспадар у апавяданні робіцца фігурай зусім эпізадычнай, чалавек не гаспадарыць, а сам дароўніваецца да істоты, якую забіваюць.

*«Бяда ўсіх раўняе. Толькі пасля Чарнобыля Бляха пазнаў, што і ён чалавек»* [2, с. 186] – пачынае сваё, можа, самае трагічнае апавяданне А. Федарэнка.

Адметны канцэптуальны змест мае апісанне смалення вепрука і ў апавяданні Андрэя Федарэнкі «Бляха» (1994 г.). Там гэтая падзея павінна была зрабіцца, згодна з традыцыяй, урачыстасцю. Але сюжэт А. Федарэнкі разгортваецца ва ўмовах страшэннай з’явы – Чарнобыля. Тэмай апавядання зрабілася паслячарнобыльская рэчаіснасць. Праз вобразы з вельмі вялікай ступенню мастацкага абагульнення пісьменнік паказвае, як глыбока разбурана, зруйнавана беларускае нацыянальнае жыццё, самі народныя тыпы і традыцыі.

Сяляне ў апавяданні – ужо не моцныя, самавітыя гаспадары, што раней не прасілі ніякай дапамогі ў такой справе, як смаленне вепрука.

Гэта нямоглыя старыя – дзед і яго жонка. Яны амаль што адны засталіся ў радыёактыўнай зоне.

Галоўны герой апавядання – «*п'янчужка, якога дражнілі Бляха*» [2, с. 188]. Аўтар піша пра яго наступнае: *«Бляха гэты быў рахманы, бяскрыўдлівы чалавек, які за чарку ішоў да любога рабіць любую работу, але ў вёсцы яго асцерагаліся і не любілі, як увогуле асцярагаюцца і не любяць на беларускіх вёсках людзей няўдалых. Ды і як любіць такога: дохлы, п'яніца, да таго ж злодзей, «цюрэмшчык»* [2, с. 186]. Асоба, скажам прама, далёка не станоўчая. Але менавіта ён у фінале аказваецца сапраўды чалавечным. З радасцю Бляха адгукнуўся на просьбу дзеда дапамагчы закалоць кабанчыка, ні разу да гэтага часу да яго ніхто не звяртаўся з падобнымі просьбамі, а тут дапамогі просіць былы лепшы гаспадар вёскі! *«Вось так пасля Чарнобыля п'янчужка, якога дражнілі Бляха, стаў чалавекам»* [2, с. 188], – зазначае аўтар. Пра распад грамадства чарнобыльскіх часоў сведчаць таксама вобразы хлопцаў-марадзёраў, якія прыязжалі ў «зону» і забіралі ўсе хоць трохі карысныя рэчы мясцовых жыхароў, што спехам пакідалі іх.

Звязвае ўсіх персанажаў вельмі важнае сюжэтна-фабульнае звяно: тая самая падзея смалення вепрука. А. Федарэнка паказвае яе як сапраўдную трагедыю заняпаду беларускага нацыянальнага быцця, у якім усё змізарнела, разбурылася, набрыняла злом і агрэсіяй.

Гадаванец знясіленых старых, вепручок, якога трэба было закалоць, – худы і маленькі. Рэжа яго не моцны, годны гаспадар, а нядбалы, хворы хлопец, у якога нават імя страцілася – яго замяніла мянушка. Таму справа, якая павінна была б выяўляць мужчынскі спрыт, ператвараецца ў пакуту: нягледзячы на падтрымку дзеда, Бляха, забіваючы ахвяру, некалькі разоў прамахнуўся: *«Раней пра такое біццё сказалі б: "От задушылі неяк…»*[2, 192].

Агульную драматычную карціну падмацоўвае мноства дэталяў – у партрэтных характарыстыках, у абставінах падзей. Урэшце мяса ахвяры адбірае марадзёр, якога тут жа рвуць, як тую свежыну, раз'юшаныя чарнобыльскія ваўкі. Бляха кідаецца на дапамогу хлопцу-марадзёру, але таксама гіне: *«Ён* (Бляха – Н. К.) *спрабаваў яшчэ адмахвацца, уцякаць, хоць бы неяк дапаўзці да дзвярэй калідора, крычаў, – але крыкі гэтыя патаналі, уплятаціся ў дзікае яхкатанне, у звар'яцелы віскат узбуджанай, паспыталай крыві гайні, якая быццам на паляванні, абклаўшы з усіх бакоў ненавіснага звера і не чакаючы знаку паляўнічага, наскоквала, і рвала, і грызла, і старалася ўпіцца ў самае горла… І не было каму памагчы, абараніць, ўратаваць, – толькі вецер свістаў ды круціў сабе снег віхурамі знізу ўверх – як на канец свету»* [2, с. 199].

У апавяданні А. Федарэнкі смаленне вепрука настолькі шчыльна спавіта змрочнымі абставінамі, што ўвесь падтэкст, звязаны з адсылкамі да гадавога жыццёвага цыклу, да кола сялянскага жыцця, набывае трагічнае гучанне.

Чытач прыходзіць да ўсведамлення: пасля Чарнобыля (а таксама пасля іншых цяжкіх катастроф) нават самыя ўсталяваныя беларускія традыцыі занепадаюць, разбураюцца, набываюць драматычную афарбоўку. Як канцэптуальны вобраз смаленне вепрука ў А. Федарэнкі азначае найперш сацыяльную трагедыю беларускай нацыі.

Такім чынам, смаленне вепрука як частка жыцця традыцыйнай беларускай вёскі ў прозе Міхася Стральцова і Андрэя Федарэнкі зрабілася асновай для канцэптуальна заглыбленых вобразаў.

М. Стральцоў звяртаецца да традыцыйнай для сябе тэмы «сена на асфальце», юнака-вяскоўца ў горадзе. Ён з незвычайнай псіхалагічнай чуйнасцю і ўражлівасцю адчувае безабароннасць чалавека перад смерцю, драму жыцця і «драму вёскі» і, на думку Уладзіміра Бойкі, можа, адзін з першых, калі не першы, па-мастакоўску выявіў яе [3, с. 12]. Але, мне здаецца, М. Стральцоў пайшоў далей і выявіў і дакрануўся да драмы чалавечай душы. Я цалкам згодная з выказваннем У. Бойкі пра тое, што да адэкватнага прачытання Стральцова – яшчэ шлях і шлях, а мы (даследчыкі і чытачы) знаходзімся на самым пачатку гэтага шляху [3, с. 12]. М. Стральцоў праз вобразы беларускай рэчаіснасці адлюстроўвае найперш экзістэнцыйнае разуменне жыцця і смерці.

А. Федарэнка з дапамогай традыцыйнага канцэпта раскрывае чарнобыльскую тэму. На гэтым матэрыяле ён асэнсоўвае трагедыю беларускай нацыі, чый жыццёвы лад, усё сацыяльнае і нацыянальнае быццё апынуліся пад пагрозай непапраўнага разбурэння. Яго апавяданне «Бляха» напісана ў рэалістычным стылі, але з такім значным абагульненнем, што ператвараецца ў своеасаблівую сацыяльную прытчу. Твор вызначаецца выразна трагедыйным пафасам.

1. Стральцоў М. Смаленне вепрука // М. Стральцоў. Выбранае: Проза, паэзія, эсэ / [Прадм. А. Адамовіча]. – Мінск: Маст. літ., 1987. – С. 173 – 182.
2. Федарэнка А. Бляха // А. Федарэнка. Смута: Аповесці, апавяданні. – Мінск: Маст. літ., 1994. – С. 186 – 199.
3. Залоска Ю. Сонечны Стральцоў // Крыніца. – 1994. – №9. – С. 10 – 17.
4. Акудовіч В. Вусцішнасць быцця / В. Акудовіч // Крыніца. – 1994. – №9. – С. 27 – 28.
5. Лявонава Е. “Палову жыцця пішу на дарозе свае імёны, палову – закрэсліваю напісанае…” / Е. Лявонава // Роднае слова. – 2007. – № 12. – С. 12 – 15.